# ИСТОРИЧЕСКАЯ ДИНАМИКА И ДУХОВНАЯ КУЛЬТУРА ОБЩЕСТВА: РЕГИОНАЛЬНЫЙ И ГЛОБАЛЬНЫЙ КОНТЕКСТ

## СУВЯЗЬ КАНФЕСІЙНЫХ ВЫДАННЯЎ З ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМІ І ЦАРКОЎНЫМІ РУХАМІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ МІЖВАЕННАГА ПЕРЫЯДУ

***Булатая В.Ю.,***
*аспірант РІВШ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Любая А.А.,*** *канд. гіст. навук, дацэнт*

Адным з аспектаў дзейнасці канфесійных арганізацый і супольнасцей была выдавецкая дзейнасць. У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі выдаваліся дзясяткі канфесійных часопісаў і газет на беларускай мове пры падтрымцы разнастайных арганізацый і рухаў. Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена недастатковай глыбінёй распрацаванасці праблемы канфесійнага беларускамоўнага друку ў Заходняй Беларусі. Даследаванне гэтай праблемы дазволіць вызначыць ідэалагічны ўплыў на тагачасную беларускамоўную прэсу. Мэта даследавання – прааналізаваць інстытуцыйную прыналежнасць канфесійнай перыёдыкі, якая выдавалася на беларускай мове, у міжваенны час.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі працы з'яўляюцца гістарыяграфічныя напрацоўкі па праблематыцы канфесійнага друку Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Так, выкарыстоўвалася праца Говіна С.В. "Канфесійны друк Беларусі [1]" і праца Трачука Е. "Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918-1939) [2]", дзе прыводзяцца агульныя звесткі аб выданнях міжваеннага часу (назва выданняў, гады выхаду, выдаўцы, кірунак). Аўтарам выкарыстоўваліся наступныя метады даследавання: агульналагічныя (індукцыя, дэдукцыя і інш.); агульнанавуковыя (кантэнт-аналіз, гістарычны, лагічны, сістэмны і інш.).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Канфесійныя супольнасці для трансляцыі сваіх поглядаў актыўна займаліся выдавецкай дзейнасцю. У красавіку 1927 г. у Вільні было арганізавана Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб'яднанне (БПДА), у кіруючы склад якога ўвайшлі А. Коўш, сенатары В. Багдановіч, А. Назарэўскі. Пры БПДА ў 1927–1928 гг. выдаваўся часопіс "Праваслаўная Беларусь". Яго выдаўцом быў протаіерэй Лука Голад [2, с. 173]. За гэты час выйшла 10 нумароў. Протаіерэй А. Коўш, настаяцель прыхода пад Вільняй, рэдагаваў часопіс "Беларуская Зарніца", які выходзіў у 1928–1929 гг. Усяго выйшла 13 нумароў часопіса. Рэдагаваў айцец А. Коўш яшчэ адзін часопіс-аднадзёнку, які выйшаў 5 студзеня 1928 г., – "Народная Ніва". Часопіс, які выдаваўся Д. Боханам, быў трохмоўны і з'яўляўся друкаваным органам Беларускага праваслаўнага дэмакратычнага аб'яднання [2, с. 159].

На з'ездзе праваслаўных беларусаў 14 сакавіка 1930 года быў створаны Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт, які ў 1930–1936 гг. выдаваў часопіс "Сьветач Беларусі". Рэдагаваў яго спачатку З. Зімавец, пасля – У. Більдзюкевіч [1, с. 60; 2, с. 183].

У 1932–1933 гг. Камітэт выдаваў часопіс "Царква і народ". Захавалася толькі два нумары гэтага часопіса. Рэдактарам часопіса быў Яўхім Красоўскі, беларускі грамадскі дзеяч, які ўваходзіў у кіраўнічыя структуры Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Выдаваўся часопіс у Вільні [1, с. 60].

"Голас праваслаўнага беларуса" – царкоўна-грамадскі часопіс. Выдаваўся ён у лістападзе – снежні 1931 г. у Вільні на беларускай мове. Рэдактар-выдавец – М. Маркевіч. Адзначаны часопіс характарызуецца як найбольш палітызаванае выданне [1, с. 60].

"Праваслаўны Беларус" – царкоўна-грамадскі, навукова-папулярны і літаратурны часопіс. Ён пачаў выдавацца з 1 лютага 1925 г. пад рэдакцыяй Івана Пачопкі [2, с. 174].



Рэпазіторый ВДУ

У 1924 г. выйшла газета-аднадзёнка “Каляда”. Яна выдавалася Антонам Пракапеням і пазіцыянавалася як грамадска-палітычная і літаратурная [2, с. 151].

У 1926 г. выйшла газета-адзнадзёнка “Калядны звон” (“Kaladny zwon”). Яна лічылася праваслаўнай газетай, выдавалася А. Мацейчыкам [2, с. 151].

Рыма-каталіцкія перыядычныя выданні грунтаваліся вакол адной асобы – ксяндза Адама Станкевіча. Ён быў адным з тых, хто выступіў заснавальнікам партыі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў Петраградзе ў 1917 годзе. Так, БХД выдавала газету “Крыніца” (“Беларуская Крыніца”) (“Krynica”, “Biełaruskaja Krynica”). Яна пачала выходзіць з 21 кастрычніка 1917 г., а 15 красавіка 1937 рашэннем Віленскага акруговага суда яна была закрыта і аднавіла работу толькі ў 1939 г. У розныя гады яе рэдагавалі А. Станкевіч, У. Знамяроўскі, Б. Туронак, Я. Пазняк. Прыпыніла газета сваё выданне ў 1940 г. [1, с. 106]. Часопіс “Хрысціянская думка” (“Chryščijanskaja dumka”) пачаў выдавацца ў 1928 г. пал рэдакцыяй А. Станкевіча. Спыніў выхад у 1939 г. [1, с. 108; 2, с. 187]. Дадаткам да часопіс стаў часопіс для дзяцей “Зорка” (“Zorka”), які выдаваўся ў 1938-1939 г. А. Станкевічам [2, с. 149].

Грэка-каталіцкая царква таксама займалася выдавецкай дзейнасцю. Так, у 1932 г. выйшаў першы нумар часопіса “Да злучэння” (“Do zluczenia”), з 1938 – “Злучэнне” (“Zluczenie”). Яго рэдактарам стаў А. Неманцэвіч – святар, доктар тэалогіі, а пасля – Беларускі экзарх грэка-каталіцкай царквы. У 1938 г. ўлады закрылі часопіс, таму рэдакцыя з Вільні пераехала ў Варшаву і выдала яшчэ 12 нумароў [1, с. 137; 2, с. 148].

Сярод пратэстанцкіх беларускамоўных выданняў найперш трэба адзначыць часопіс “Новы Шлях”. Ён пазіцыяніраваўся як незалежны культурны-рэлігійны часопіс царквы метадыстаў. Пачаў выдавацца 1 лютага 1929 г. пад рэдакцыяй пастыра С. Барткевіча. Газета “Сьветач Хрыстовае навукі” выходзіла ў 1935–1937 гг. і рэдагавалася пастырам Янам Пятроўскім. Як адзначаюць даследчыкі Ю. Бачышча і А. Унучак, “паводле рэгістрацыйных дакументаў, яна насіла рэлігійна-літаратурны характар, але на думку польскіх улад фактычна выконвала рэлігійна-грамадскую функцыю” [3, с. 177–178]. «Дух і Праўда» – беларускамоўны дадатак да штомесячнага польскага метадысцкага выдання „Pielgrzym Polski”. Дадатак рыхтаваў да друку Г. Леўчык. Па сутнасці, гэты часопіс прадстаўляў працу місіянерская царквы метадыстаў у Беларусі [2, с. 144].

**Заключэнне.** Такім чынам, разгледзеўшы інстытуцыйную прыналежнасць канфесійных беларускамоўных выданняў міжваеннага часу, можна адзначыць наступнае. Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб’яднанне выдавала 3 сродкі масавай інфармацыі. Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт – 2. Астатнія праваслаўныя СМІ не мелі палітычнай альбо ідэалагічнай прыналежнасці, але мелі палітычны і рэлігійны кантэнт, былі аднадзёнкамі. Каталіцкія беларускамоўныя выданні былі цалкам палітызаваныя, прадстаўлялі каштоўнасці і ідэі партыі БХД. Грэка-каталіцкія выданні мелі статус афіцыйнага друкаванага органа ГКЦ у Заходняй Беларусі. Адрозненне пратэстанцкіх выданняў ад выданняў іншых канфесій заключаецца ў тым, што хоць два з іх і выдаваліся пастырамі, але афіцыйна яны насілі культурны-рэлігійны характар. Аднак адно пратэстанцкае выданне, хоць і ў якасці беларускамоўнага дадатку, але насіла характар друкаванага органа царквы метадыстаў. Абагульняючы, можна адзначыць, што большая частка канфесійнай прэсы міжваеннага часу, якая выходзіла на беларускай мове, як правіла, паходзіла з палітычных структур, якія не былі наўпрост звязаныя з царкоўнай адміністрацыяй, або выдавалася духоўнымі асобамі, але рэгістравалася як царкоўна-грамадскія ці рэлігійна-літаратурныя выданні.

1. Говін, С. В. Канфесійны друк у Беларусі / С. В. Говін. – Мінск : БДУ, 2008. – 287 с.

2. Traczuk, J. Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918-1939) / Jerzy Traczuk. – Siedlce : Wydawnictwo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. – 270 s.

3. Бачышча, Ю., Унучак, А. Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі (1918–1939) / Ю. Бачышча, А. Унучак // Przegląd Środkowo-Wschodni – 2019. – Т. 4. – С. 159–182.

Рэпазіторый ВДУ